**ВОЛЬГА ЛАБАЧЭЎСКАЯ.**

**«Пісанае» дрэва - карцы.**

# Гісторыя калекцыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь: паходжанне, функцыя, семантыка мастацкай формы і арнаменту

Драўляныя коўшычкі-карцы, якія захоўваюцца ў зборы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (НГМ РБ) у колькасці 54 адз., застаюцца загадкай для даследчыкаў. Яны прыцягваць да сябе ўвагу мастацкасцю, выразнай архаічнай скульптурнасцю. Невялікія драўляныя карцы ў сваіх формах і аздобах нясуць адбітак старажытных часоў, калі рэч была адначасова прадметам і рытуальным атрыбутам. Іх адметнасцю з'яўляюцца ручкі, пластыка якіх нагадвае выявы галавы каня, або пеўня. Яны ўпрыгожаны скразнымі круглымі адтулінамі, рыскамі, складзенымі ў арнамент, і выявамі крыжоў. Дзякуючы выразнасці форм, этнічнай распазнавальнасці, драўляныя карцы набылі знакавую функцыю ў беларускай культуры. Іх выявы змешчаны на паштовых марках, выкарыстоўваюцца ў прыкладной графіцы.

Разам з тым, аб іх саміх мала што вядома. Калекцыя паходзіць з даваенных збораў Беларускага дзяржаўнага музея (БДМ). Побач з яго нумарамі на карцах, нібы татуіроўка, нанесены і іншыя нумары, якія даваліся гэтым рэчаму савецкі час пры чарговай перамене музеем сваёй назвы. У перыпетыях музейнага жыцця карцы згубілі гісторыю свайго паходжання, невядома іх прызначэнне, імёны іх збіральнікаў. Іх пашпартныя даныя былі страчаны ў гады Другой сусветнай вайны, калі калекцыя, сярод іншых мастацкіх каштоўнасцей мінскіх музеяў, была вывезена ў Германію. У спісе экспанатаў Беларускага дзяржаўнага музея, якія былі вернутыя БССР, пазначаны толькі інвентарныя нумары і назвы коўшычкаў, у некалькіх выпадках іх вышыня [1, с. 81-87].

## Дакументацыя аб карцах Беларускага дзяржаўнага музея.

Здавалася, што ўжо няма магчымасці адшукаць, адкуль паходзяць гэтыя прыгожыя рэчы беларускай драўлянай пластыкі. Але дакументы, якія даюць нам магчымасць зразумець, для чаго беларусы рабілі маленькія драўляныя карцы і каму з даследчыкаў павінны мы быць удзячныя за захаванне гэтых здабыткаў беларускага мастацтва, па шчасцю, захаваліся. Яны былі прывезены на Беларусь у 1989 г. Здавалася, аб іх ведалі, але да гэтага часу дакументы не зацікавілі даследчыкаў народнага мастацтва і музейных супрацоўнікаў.

Размова ідзе пра фотаздымкі кафедры этнаграфіі Інстытута беларускай культуры (Інбелкульт), зробленыя ўлетку 1928 г. падчас экспедыцыі па маршруце Слуцк - Асташкавічы пад кіраўніцтвам В. Ластоўскага - ўсяго 270 кадраў мікрафільма. Іх атрымаў А. Мальдзіс у Беларускім навукова-даследчым цэнтры імя Ф. Скарыны ад айца А. Надсана ў Лондане і прывёз у Мінск. Калісьці ў экспазіцыі музея былога Цэнтра імя Ф. Скарыны ў Мінску можна было бачыць рэпрадукцыю вокладкі альбома гэтых фотаздымкаў, які прываблівaў назвай і густоўным мастацкім афармленнем. Мікрафільм быў перададзены на захаванне ў аддзел рукапісаў і рэдкай кнігі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі. Цяпер ён алічбаваны і з ім лёгка працаваць [2]. Гэтыя фотадакументы з падрабязнымі тагачаснымі анатацыямі ўтрымліваюць у сябе каштоўнейшую інфармацыю па гісторыі беларускага мастацтва: сакральнай і народнай архітэктуры, царкоўным старажытнасцям, этнаграфіі беларусаў, народнаму касцюму і тканінам, разьбе па дрэве, у тым ліку і па «бяспашпартным» драўляным карцам у зборы НГМ РБ.

Абапіраючыся на гэтыя дакументы, паспрабуем высветліць гісторыю калекцыі, акрэсліць месцы паходжання карцоў і на гэтай падставе разгледзець пытанне аб функцыянальным прызначэнні прадметаў, якое не закранaлася ў мастацтвазнаўчых працах, а існуючыя атрыбуцыі гэтых прадметаў нельга лічыць пераканаўчымі [3].

Экспедыцыя 1928 г., якой тычацца згаданыя фотаматэрыялы, была наладжана кафедрай этнаграфіі Інбелкульта разам з Беларускім дзяржаўным музеем. Ёй кіраваў В. Ластоўскі, які ў той час быў загадчыкам кафедры этнаграфіі і адначасова дырэктарам БДМ. На трох фотаздымках бачым удзельнікаў экспедыцыі: Вацлава Ластоўскага і яго жонку Святлану, Аляксея Міхайлавіча Паўлава, Тодара Гольмажэана [2, фота № 30,180, 181].

Фотаздымкі, якія захаваліся з гэтага падарожжа, зроблены мастаком-фатографам Т. Гольмажэана. Дзякуючы сучасным магчымасцям атрымання інфармацыі пра сетку Інтэрнэт, удалося знайсці даныя пра гэтага чалавека, які на фотаздымках вылучаецца чарнявым тварам. На той момант яму было 38 гадоў, ён скончыў аддзяленне архітэктуры Вышэйшай тэхнічнай вучэльні ў Будапешце і два гады вучыўся на аддзяленні пластыкі Акадэміі мастацтва ў Мюнхене, валодаў сямю мовамі, быў у замежных камандзіроўках у Італіі і Егіпце. Вядома, што ў 1928 г. ён, вугорац па нацыянальнасці, атрымаў грамадзянства СССР [4]. Т. Гольмажэана цікавіўся народным мастацтвам і з'яўляўся аўтарам працы «Венгерскія дэкаратыўныя матывы ў аздобах» (1913). Верагодна, дзякуючы знаёмству з В. Ластоўскім па прыездзе ў Мінск ён атрымаў працу мастака і фатографа ў Беларускім дзяржаўным музеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уважлівы прагляд і аналіз фатаграфічнай калекцыі паказаў, што не ўсе 270 фотаздымкаў зроблены ў экспедыцыі 1928 г. Частка з іх з'яўляецца стацыянарнай фотафіксацыяй экспанатаў Беларускага дзяржаўнага музея. Да іх ліку адносяцца 25 фота, на якіх зафіксаваны драўляныя карцы - ўсяго 43 адз., большасць якіх была набыта падчас згаданай экспедыцыі. У подпісах пад фотаздымкамі пазначаны інвентарны музейны нумар БДМа, назва прадмету з кароткім апісаннем, ад каго і за якую суму ён быў набыты, прыблізныя звесткі аб тым, калі рэч была зроблена, месца і дакладная дата набыцця. У1933 г. М. Нікольскі скарыстаў для ілюстрацый сваёй працы «Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераньнях беларускага сялянства» шэсць фота карцоў менавіта з гэтых музейных фотаздымкаў, але не вельмі дакладна падаў месцы іх паходжання [5, сс. 109-112,134].

**Месцы паходжання карцоў і бажніц і лакалізацыя традыцый іх вырабу.**

Уважлівае знаёмства і аналіз з архіўнымі фотаматэрыяламі дазваляе вярнуць экспанатам НГМ РБ іх гісторыю і лакалізацыю. На падставе спіса калекцыі карцоў, які склала навуковы супрацоўнік музея Дар'я Шэіна з пералікам усіх папярэдніх музейных нумароў гэтых экспанатаў, стала магчыма суаднесці тыя прадметы, якія сёння маюцца ў наяўнасці, з зафіксаванымі на фотаздымках, і ў большасці выпадкаў вызначыць месца іх паходжання і дату паступлення ў музейны збор.

З 43 карцоўпераважная большасць паходзяць з былога мястэчка Даманавічы (Калінкавіцкі р-н) і бліжняга наваколля. З в. Даманавічы - 5 экспанатаў: ад М. Пінчук (КП 2033, КП 1972)[1], Аўгіні Доўба (КП 1983, не захаваўся № 197/1), Цімоха Захарэнкі (КП 2003). З в.Анісавічы (злілася з Дамановічамі) - 2: ад Аўхіні Чыгіравай (КП 1993), Пелагеі Цімох (КП 1934). З вЛампекі (зараз не існуе) - 10: ад Агапы Сапоненка (КП 1964), Агаты Сапоненка (КП 1996),
М. Гвозд (КП 2006), Просі Мельнік з (КП 1976), Куліны Мірок (КП 1987), Марыі Кенавай (КП 1979), П. Качана (КП 2032), Давыдзей (КП 2001), Рыгора Сапаненкі (КП 1986), Мірона Сапаненкі (КП 1995, не захаваўся № 262/2). Не вызначана месцазнаходжанне в. Сарынічы, у якой ад Карнея Пінчука быў набыты адзін карэц (КП 1965), але мяркуючы па даце набыцця - 5.VII.28, якая супадае з датай набыцця экспанатаў у Даманавічах і наваколлі, ён таксама паходзіць з гэтай мясцовасці. На тэрыторыі сучаснага Калінкавіцкага р-на па аднаму карцу было набыта ў вёсках Халаднікі ад Палагеі Булаевай (КП 1990), Казловічы - ад Матруны Мятлушкі (КП 1998), Лісец - ад Аўдоцці Варабей (КП 2031), Давыдавічы ад - П. Гусак (КП 1991). У в. Асташкавічы (Светлагорскі р-н) набылі восем карцоў: ад Ганны Яцко (КП 1968), Якуба Захарэнкі (КП 1971), Хвядоры Захарэнкі (КП 1989), Яв. Пінчук (КП 1985, КП 1977), Кацярыны Пінчук (КП 2029, не захаваўся 252/2), і невядома ад каго (КП 2000). За карцы музей плаціў па 50 кап. ці па 1 руб.

Калекцыя драўляных карцоў БДМ пачала фарміравацца з экспанатаў, якія паступілі ў 1922 г. ад Мінскага таварыства гісторыі і старасвеччыны. Згодна з анатацыяй на архіўных фотаздымках такіх карцоў было чатыры і паходзілі яны з Барысаўскага павету. У зборы НГМ РБ выяўлены тры прадметы (КП 2007, КП 2008, КП 2009), на двух з іх захаваліся наклейкі, на якіх пазначана, што яны былі набыты Таварыствам 1 чэрвеня 1914 г. Меліся і іншыя паступленні: 17 чэрвеня 1927 г. ад Баравіка з в.Мацэявічы Бярэзінскага р-на (КП 1975), два карцы з Дзісенскага пав. на Віленшчыне (КП 1992, не захаваўся № 177/1); два - з Віцебшчыны (КП 2005, не захаваўся №176/2), адзін са Слонімшчыны (КП 2018); месца паходжання яшчэ аднаго прадмета (КП 1972) невядома. На двух прадметаху зборы НГМ РБ ёсць надпісы: «№ ..8 / W.L.»
(КП 1988), «22 W.L.» (КП 2005). Абрэвіятура сведчыць, што яны належалі да прыватнага збору В. Ластоўскага. Верагодна, карцы былі перададзены ім у калекцыю БДМ, бо ўстаноўлена наяўнасць аднаго з іх - карца з Віцебшчыны (КП 2005) на архіўным фотаздымку (№176/1). На архіўных фотаздымках ёсць не ўсе карцы, якія знаходзяцца ў фондах НГМ РБ і маюць старыя інвентарныя нумары БДМ; гэта значыць, што даваенная калекцыя такіх прадметаў была большая па колькасці.

Атрымліваецца, што больш за палову калекцыі карцоў, якая ёсць у НГМ РБ, а менавіта 28 прадметаў былі набыты экспедыцыяй В. Ластоўскага ў ліпені 1928 г. Усе яны сабраны на кампактнай тэрыторыі, якая акрэсліваецца трохкутнікам населеных пунктаў Азарычы - Даманавічы - Асташкавічы ў Калінкавіцкім і Светлагорскім р-нах Гомельскай вобласці.

З акрэсленай тэрыторыі паходзілі таксама іншыя цікавыя творы беларускай народнай разьбы па дрэве, якія былі набыты разам з карцамі экспедыцыяй В. Ластоўскага. Гэта бажніцы - драўляныя скрынкі для абразоў, аздобленыя трохгранна-выямчатай разьбой і выявамі крыжоў. На фотаздымках ёсць сем выяў бажніц, тры з якіх набыты ў в. Асташкавічы, па адной у вёсках Давыдавічы і Лісец; да дзвюх бажніц няма анатацый. У наяўных анатацыях на бажніцы, як да карцоў, прыведзены інвентарныя нумары БДМ. У калекцыі сучаснага НГМ РБ гэтыя прадметы адсутнічаюць. Не згадваюцца яны ў спісе беларускіх музейных каштоўнасцей, вернутых з Германіі ў 1947 г. [1]. Можна меркаваць, што гэтыя выразныя мастацкія рэчы захоўваюцца ў якіх-небудзь прыватных або

[1] Тут і далей пазначаны інвентарныя нумары экспанатаў НГМБ. Яны былі ўстаноўлены аўтарам пры супастаўленіі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музейных зборах у іншых краінах. Таму варта прывесці звесткі аб іх з інвентарнымі нумарамі БДМ, каб НГМ РБ мог пачаць іх пошук, як музейных каштоўнасцей, згубленых Беларуссю ў гады Другой сусветнай вайны.

У в. Асташкавічы бажніцы былі набыты ад Ганны Захарэнка (фота № 35, БДМ 7179/19), Кацярыны Пунтус (фота № 164, БДМ 7179/17), Агаты Крупенка (фота № 165, БДМ 7179/18), в. Давыдавічы ад Іллі Новіка (фота № 167, БДМ 7179/6), в. Лісец ад Маісея Старавойтава (фота № 213, БДМ б/н). Дзве бажніцы на фотаздымках за №№ 166 і 214 не маюць анатацый. У некаторых подпісах пад фотаздымкамі пазначана, што бажніцы былі выраблены 70-80 гадоў таму дзедам або прадзедам гаспадара, ад якога яны былі набыта. Так, дзед Агаты Крупенка з а. Асташкавічы рабіў бажніцу на сваё вяселле. Час стварэння драўляных бажніц з прыгожай разьбой прыпадае на перыяд 1-й пал. - сяр. XIX ст. Да гэтага часу можна аднесці і карцы, хаця некаторыя з іх адпаведна анатацыям былі выраблены 20-25 год да іх набыцця - гэта значыць у к. XIX - пач. XX ст. Экспедыцыя купляла бажніцы для музея за адзін, два, тры ці нават пяць рублёў.

**Зніклыя артыкул «Пісанае дрэва» і справаздача аб экспедыцыі 1928 г.**

Архіўная фотадакументацыя вяртае ў беларускую культурную спадчыну каштоўны і багаты на мастацкія традыцыі пласт народнай разьбы па дрэве. Калі далучыць тое, што мы ведалі раней, - бажніцы і карцы, якія экспанаваліся на Першай Усерасійскай этнагафічнай выстаўцы 1867 г. (пасля захоўваліся ў зборы Дашкоўскага музея), на выстаўцы народнага мастацтва і рамёстваў 1913 г. у Вільні [6, с. 58], «багоўню» з Чэрыкаўскага павету са збору 1908 г.

А. Мілера ў Расійскім этнаграфічным музеі, выяўляецца вельмі цікавая і своеасаблівая традыцыя беларусаў аздабляць драўляныя прадметы разьбой [7, сс. 37, 120]. У болыпасці ўсе яны паходзяць з паўночна-цэнтральных і ўсходніх раёнаў Беларусі. Колькасць падобных экспанатаў сведчыць аб устойлівасці стварэння і ўжывання такіх прадметаў з дрэва. Дададзім, што на беларускіх тэрыторыях хутчэй за ўсё была сабрана таксама калекцыя з 21 драўлянага карца, якая ў пач. XX ст. мелася ў Гісторыка-этнаграфічным музеі княгіні М. Ценішавай у Смаленску і ў каталозе музея пазначаная пад назвай «ковшички деревянные с резными ручками» [8, с. 9, №№ 107-128].

Невыпадкова В. Ластоўскі звярнуў на гэтую з'яву сваю ўвагу і прысвяціў ёй артыкул «Пісанае дрэва (аб конаўках, бажніцах, пернічных дошках)». Назва артыкула паходзіць ад народнай назвы разьбянага аздаблення, якое было зафіксавана экспедыцыяй. «Бажніца драўляная "пісаная"» - менавіта так пазначана ў анатацыях да фотаздымкаў. Беларускае слова «пісаць» зыходзіць ад праславянскай формы pbsati, адно з семантычных значэнняў якога - наносіць на паверхню графічныя знакі, літары, а таксама ствараць мастацкі твор. Артыкул В.Ластоўскага, прысвечаны мастацкаму аздабленню драўляных прадметаў у беларусаў - «конаўкам» - карцам, бажніцам, грунтаваўся на тых матэрыялах, што былі сабраны ім у экспедыцыі 1928 г. Вядома, што яна была вельмі плённай і папоўніла БДМ значнай колькасцю здабыткаў [9, с. 194]. Часопіс «Полымя» у раздзеле «Хроніка культуры» за 1928 г. адзначыў сярод іншага наступнае: «...Экспедыцыя знаёмілася на месцы з рознымі прадметамі, якія маюць археалагічнае і гістарычнае значэньне» [10, с. 59].

На вялікі жаль, пазнаёміцца з артыкулам В. Ластоўскага «Пісанае дрэва», як і іншым яго артыкулам «Экспедыцыя длявывучэньнябеларускайнароднайвопраткіінароднагамастацтва» па выніках экспедыцыі 1928 г. па маршруце Слуцк - Асташкавічы, не ўяўляецца магчымым. Названыя артыкулы былі змешчаны ў II томе «Прац катэдры этнаграфіі» ў серыі «Запіскі аддзелу гуманітарных навук» Інбелкульта. На гэтае выданне і згаданыя артыкулы некалькі разоў спасылаецца М. Нікольскі ў кантэксце крытыкі нацдэмаўскай этнаграфіі. У1933 г. у кнізе «Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераньнях беларускага сялянства» ён дае спасылку на артыкул В. Ластоўскага «Экспедыцыя для вывучэньня беларускай народнай вопраткі і народнага мастацтва», дакладна падаючы старонкі і нумар адпаведнай ілюстрацыі [5, с. 13]. У 1938 г. у працы «Устаноўкі і метады беларускай нацдэмаўскай этнаграфіі» М. Нікольскі зноў згадвае гэту публікацыю [11, с. 13] і дае разгорнутую крытыку палажэнням артыкула В. Ластоўскага «Пісанае дрэва (аб конаўках, бажніцах, пернічных дошках)» [11, с. 14]. У спасылках не пазначаны год выдання 2-га тома «Прац катэдры этнаграфіі» Інбелкульта. Калі 1-шы том «Прац» убачыў свет у 1928 г., то верагодна, што 2-гі том выйшаў з друку ў 1929 г. Разам з тым, пошук кнігі, здзейснены намі і супрацоўнікамі Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, не даў вынікаў. Такога выдання няма ў буйных бібліятэках Мінска, Вільнюса, Масквы, Санкт-Пецярбурга. Што гэта азначае? Адказ на пытанне можна знайсці, узяўшы пад увагу лёс. В. Ластоўскага, які быў аўтарам і рэдактарам гэтага тома.

Плённы перыяд навуковай і музейнай дзейнасці В. Ластоўскага пасля вяртання з Коўна ў красавіку 1927 г. быў, на вялікі жаль, вельмі кароткі. Ужо ў жніўні 1929 г. ён быў звольнены з пасады дырэктара БДМ, 20 лістапада вызвалены з пасады сакратара Беларускай Акадэміі навук, а 21 ліпеня 1930 г. арыштаваны ДПУ БССР па справе «Саюза вызвалення Беларусі». Выкажам гіпотэзу, што ў сувязі з распачатым у канцы 1929 г. камуністычнай партыяй Беларусі наступлением на нацыянал-дэмакратызм і рэпрэсіямі супраць дзеячаў беларускай культуры і навукі, у лік якіх сярод

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

першых трапіў В. Ластоўскі, 2-гі том выдання «Працы катэдры этнаграфіі» Інбелкульта мог быць канфіскаваны пасля выхаду. Таму ў «Летапісу беларускага друку» за 1929 і 1930 гг. «Працы» не згадваюцца. Аднак, калі апантанны крытык нацдэмаўскай этнаграфіі М. Нікольскі ў 1933 і 1938 гг. спасылаўся на дакладныя старонкі артыкулаў В. Ластоўскага ў гэтым выданні, гэта значыць, што кніга існавала. Магчыма, яна захоўвалася ў асабістай бібліятэцы акадэміка.

Паводле М. Нікольскага ў артыкуле «Пісанае дрэва» В. Ластоўскі разглядаў разьбярскія драўляныя вырабы: дошкі для пячатання ўзораў на перніках, конаўцы з разьбянымі ручкамі і бажніцах-шкаўчыках для абразоў. Конаўкі і бажніцы мелі шырокае распаўсюджанне ў вёсцы і рабіліся вясковымі, часткова гарадскімі саматужнікамі, якія пры іх вырабе следавалі традыцыйным узорам. Усе прадметы з'яўляліся экспанатамі БДМ іэтнограф ставіўперад сабой задачу іх публікацыі і асэнсавання. Карцы і бажніцы В. Ластоўскі адносіў для прадметаў «рэлігійна-магічнага ўжытку», апісаў тэхнічны і стылістычны бок іх арнаменту, вызначыў іх як нацыянальна-самабытную з'яву. Акрамя выявы круга на карцах як сімвала сонца, этнограф не разглядаў у артыкуле міфалагічны змест і магічнае значэнне арнаменту, за што яго крытыкаваў М. Нікольскі [11, с. 25-26].

Калі асобнік 2-га тома «Працы катэдры этнаграфіі» адшукаецца, мы атрымаем каштоўныя звесткі па беларускай этнаграфіі наогул і ў прыватнасці аб мастацкіх традыцыях на Беларусі разьбяных - «пісаных» вырабаў з дрэва і іх ужыванні ў абрадах і побыце.

**Функцыянальнае прызначэнне карцоў.**

Спроба вызначэння функцыі карцоў была зроблена супрацоўнікам НГМ РБ Г.Сівохіным, які склаў каталог калекцыі, вызначыўшы іх як «сальніцы». Разам з тым, беспадстаўнае сцвярджэнне аўтара, што ў выпадку з карцамі «мы маем справу не з уласна карцамі, а альбо "цацкамі", альбо стылізаванымі пад карцы прадметамі ўтылітарнага прызначэння», не грунтуецца на веданні асаблівасцей функцыянавання прадмета ў традыцыйнай сялянскай культуры. Аўтар, не зрабіўшы пераканаўчага навуковага абгрунтавання, толькі на падставе таго, што на Беларусі мелі распаўсюджанне стылізаваныя сальніцы-карцы, палічыў «мэтазгодным вызначыць дадзеныя прадметы менавіта як рытуальна-святочныя сальніцы» [3, с. 83-84]. З атрыбуцыі застаецца незразумела, у якім рытуальным кантэксце ўжываліся гэтыя прадметы і чаму яны мелі такі невялікі памер?

Паспрабуем адказаць на пытанне: з якой мэтай ствараліся і як выкарыстоўваліся разьбяныя карцы?

Звяртае ўвагу тое, што яны вельмі маленькія па памерах - іх аб'ём складае прыкладна 100 мл. У зборы НГМ РБ памеры коўшычка складаюць прыкладна ад 4,5-5,5 да 6,5-7,5 см і не перавышае 8 см у даўжыню [3, с. 84-93]. Адзін з коўшычкаў, які быў у калекцыі Музея ім. Ів. Луцкевіча ў Вільні, меў памеры 8,7 х 4,5 х 5,3 см [ 12, с. 164]. Зыходзячы з гэтага, нам не ўяўляецца слушным меркаванне Я. Сахуты аб тым, што карцы ўжываліся для піцця вады і квасу [6, с. 58; 13, с. 67]. Дзеля гэтага яны надта маленькія. Тэта не былі ўжытковыя прадметы. Архаічнасць выяўленчай пластыкі карцоў, спосабы іх аздаблення як «своеасаблівая эстэтычная сістэма, што захавалася з глыбокай старажытнасці» [ 13, с. 64], у чым з названым вышэй аўтарам можна цалкам пагадзіцца, могуць сведчыць выключна аб рытуальнай прыналежнасці такіх прадметаў, іх выкарыстанні ў абрадах як посуду для піцця спецыяльных напояў.

Беларускі даследчык народнага мастацтва М. Кацар згадвае, што карцы выкарыстоўваліся для піцця гарэлкі [ 14, с. 117-118]. У Нацыянальным музеі Літвы падобныя драўляныя коўшычкі апісаны як «посуд для піцця гарэлкі». У анатацыях да трох архіўных фотаздымкаў карцоў з экспедыцыі В. Ластоўскага і збору БДМ знаходзім заўвагі аб іх прызначэнні: для піцця вады (КП 1982) і для гарэлкі (КП 1975, КП 2009). М. Нікольскі вызначае карцы як «судзіны для піцья і напояў» і піша: «Гэтыя коўшыкі ўжываюцца на грамадскіх сьвяточных вечарох, на вясельлі, хрэсьбінах, хаўтурах, г. зн. маюць адносіны да культу; яны таксама служаць для зачэрпваньня піва або мёду з "кадушак" або брацін на грамадскіх сялянскіх сьвятах, т. зн. "сьвячах", якія цяпер прыстасоўваюцца да хрысціянскіх свят, але маюць дахрысціянскае паходжаньне» [5, с. 19]. У спасылках даследчык паведаміў, што звесткі аб ужыванні такіх прадметаў пры святкаванні «свячы» ён атрымаў ад І. Сербава. Аўтар працы «Жывёлы ў абрадах і вераньнях беларускага сялянства», які не меў уласнага вопыту палявых даследавання на Беларусі, хутчэй за ўсё скарыстаў і даныя з артыкула «Пісанае дрэва» В. Ластоўскага. На каштоўную інфармацыю аб рытуальнай функцыі карцоў у працы М. Нікольскага сучасныя даследчыкі беларускай народнай разьбы па дрэве не звярталі ўвагі.

Карцы не былі звычайным побытавым посудам. Яны выкарыстоўваліся ў сацыяльна значных для сялянскай сям'і, роду, грамады выпадках - у сямейнай і грамадскай абраднасці і мелі культавае прызначэнне. Ролю культавага посуду М. Нікольскі прасочвае на шырокім параўнаўчым этнаграфічным і археалагічным матэрыяле па беларусах і іншых народах, падрабязна разглядаючы апатрапейную ролю выяў птушыных і конскіх галоў. Ён робіць выснову, што беларускія судзіны, а таксама і іншыя падобныя прадметы, у тым ліку расійскія, аздабляліся гэтымі вобразамі з апатрапейнымі мэтамі: «птушкі і конікі павінны былі адганяць ад судзін злых духаў і духаў мёртвых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і забясьпечываць напіткі, якія наліваюцца ў судзіны» [5, с. 21-22]. Суаднясенне драўляных коўшычкаў-карцоў з традыцыямі ўжывання беларусамі падчас сямейных абрадаў і грамадскіх рытуалаў, як, напрыклад, «мядовых брацтваў», «свяча», і ў памінальных трапезах спецыяльных напояў - пітнага мёду, піва і пазнейшай за іх гарэлкі, можа даць ключ да разумения іх рытуальнай функцыі.

Па археалагічных матэрыялах В. Сядова з раскопак у Ноўгарадзе X ст. і Смаленску XII ст. вядома, што драўляныя каўшы ўваходзілі ў рытуальны інвентар братчын-піроў: з іх пілі абрадавыя напоі, пакідалі ў зямлі ўверх дном у якасці ахвярапрынашэння, ці захоўвалі да наступнай братчыны і не карысталіся ім у гаспадарцы [15, с. 257-258]. Мёд варылі і ўрачыста калектыўна распівалі падчас «братчын» [16, с. 306]. Рытуальным напоем было піва з жыта або ячменю з хмелем. Вялікую ролю піва мела ў вясельнай, пахавальнай і памінальнай абраднасці беларусаў [17, с. 361]. Напрыклад, беларусы-«самаходы», якія перасяліліся з Магілёўскай губерні ў Сібір (Цюменская вобл.) у к. XIX ст., і сёння вараць піва, калі святкуюць Раство Хрыстова і пераносяць у гэты дзень з дома ў дом агульнавясковую святыню - ікону, якую называюць «Свяча» [18, с. 306].

У XVIII ст. гарэлка выціскае піва і пітны мёд, але захоўвае ролю рытуальнага напою, аб чым сведчаць пахавальныя традыцыі беларусаў. Пасля пахавання нябожчыку ставілі на стол асобную чарку ці лілі на абрус гарэлку са словамі: «Хадзі, выпі чарачку гарэлкі» [ 19, с. 117]. Для рытуальных напояў патрабаваўся адмысловы посуд. У беларускім фальклоры назва такога посуду - «чарка». Чарка была мерай вадкасці, якая раўнялася 1/100 вядра, або палову кварты - трохі менш за 123 мл. Менавіта такі аб ем змяшчае больиасць драўляных карцоў. Гэтай мерай вызначалася колькасць крэпкага напою, які ўжываўся падчас рытуалаў, якія адбывалі не толькі пры застоллі, а таксама каля парогу хаты (сустрэча маладых на вяселле), на могілках (пасля пахавання нябожчыка, у памінальныя дні). Натуральна, што ў сялянскай культуры такі посуд быў драўляны.

Іншыя віды пітнога посуду ў беларусаў носяць наступныя назвы: «кубак», «конаўка» або «кухліх», «куфель». Яны звычайна мелі конусападобную форму і аб'ём да ад 1 л. Такімі назвамі часцей за ўсё вызначалі формы посуду для пітва з гліны або металічныя, а пазней - з парцэляну і шкла. У калекцыі НГМ РБ да гэта тыпу пітнога посуду адносіцца толькі адзін прадмет, выдзяўбаны з «чачоткі» конусападобнай формы з ручкай (КП 2028), які належыць вызначыць як «конаўку». Пашырэнне ў сялянскай культуры металічнага і шклянога посуду і ўжывання гарэлкі ў к. XIX - пач. XX ст. выціснула з рытуальнай і штодзённай побытавай культуры драўляны посуд.

Такім чынам, можна вызначыць наступнае: драўляныя карцы - гэта рытуальна-абрадавы посуд для пітва моцных напояў: пітнога мёду, піва і гарэлкі, які бытаваў у беларусаў да к. XIX - пач. XX ст. У сялянскіх сем'ях было па некалькі такіх прадметаў, аб чым сведчыць архіўная дакументацыя. У ёй пазначана, што ад аднаго гаспадара ў шэрагу выпадкаў было набыта па два карцы. Можна меркаваць, што сяляне захоўвалі карцы, якія былі выкананы ў розны час прадстаўнікамі розных пакаленняў мужчын у сям'і. Дацiроўку карцоў неабходна таксама ўдакладніць. Яны адносяцца да сярэдзіны - канца XIX ст., але іх мастацкі стыль захаваў пластычны адбітак светаўспрымання беларусаў больш глыбокай язычніцкай старажытнасці.

**Мастацкі стыль, вобразная семантыка і арнаментыка карцоў.**

Прадстаўнічая калекцыя карцоў ў НГМ РБ складаецца ў пераважнай болыпасці з народных вырабаў, якія вылучаюцца архаічнасцю свайго мастацкага стылю. Стылістычны аналіз гэтых прадметаў дазваляе вылучыць у іх асаблівыя мастацка-канструктыўныя рысы, а параўнанне з падобнымі творамі іншых народаў, напрыклад, рускімі брацінамі і скапкарамі, дае магчымасць выявіць іх этнічная прыкметы, якія можна вызначыць як беларускія. Па канструкцыі беларускія карцы ўяўляюць сабой невялічкую ёмістасць, з драўлянага масіву якой па дыяганалі вырастае частка, функцыя якой - служыць ручкай ці зачэпкай. За ручку такі посуд зручна браць, за кручок на ручцы мажліва падвесіць за край большую ёмістасць з напоем. Але зачэпкі ёсць не ва ўсіх, а толькі на 14 карцах. Большасць карцоў маюць плоскія ручкі з адтулінамі і дзірачкамі. Усе карцы гарызантальна арыентаваныя, прыземістыя ў формах, вертыкальнасць ручак у іх слаба выяўлена. У іх прасочваецца пластычны і семантычны правобраз карца - птушкі, якая плыве па вадзе. Дыяганальная лінія ручкі арганічна вырастае з формы карца, надае яго пластыцы дынамічнасць. Нават пры абагуленым вырашэнні ў абрысе і пластыцы ручкі не праглядаецца натуральных форм першавобраза. Аднак «птушыны» вобразна-мастацкі характар карца лёгка распазнаецца. Здаецца, што беларускія карцы нясуць на сябе адбітак сівых касмаганічных міфаў аб дыміургічнай ролі птушкі-качкі ў стварэнні Сусвету (зямлі) [20, с.347]. Беларускі фальклор не захаваў гэтага сюжэту, але пластыка драўляных карцоў, чарпакоў і сальніц, якія ўжываліся ў абрадах і побыце беларусаў яшчэ на пачатку XX ст. захоўвалі гэты міфалагічны вобраз.

Аналізуючы апатрапейную функцыю драўляных карцоў як рытуальнага посуду, М. Нікольскі разглядаў выявы на іх грэбянёў пеўняў і конскіх галоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[5, с. 21]. Прытым даследчык не звярнуў увагі на тое, што на сямі карцах з калекцыі БДМ птушыная галава спалучаецца з выявай кола, кола з крыжам, - якія можна лічыць салярнымі знакамі. Выява птушкі з салярным сімвалам над ёй сустракаецца з эпохі неаліту [21, с. 346]. Пластыка птушак-карцоў выклікае ў нас уражанне, што птушка плыве і нібы галавою штурхае сонечнае кола ўверх, дагары (КП 1992, КП 2008, КП 44182), або трымае яго дзюбай (КП 1971). Гэты мастацка-пластычны вобраз суадносіцца з шырока распаўсюджанымі ў культуры розных народаў уяўленнямі аб сувязі птушкі з салярнай сімволікай. Ёсць карцы, дзе кола спалучаецца з галавой каня (КП 2005), што можа быць суаднесена з касмаганічным вобразам «качкі-коня», які тлумачыцца Б. Рыбаковым як увасабленне геацэнтрычнай карціны сусвету: у дзень сонца рухаецца па небе над зямлёй і яго цягнуць коні, а ноччу сонца плыве па падземным акіяне, дзякуючы штурханню качак [22, с. 549-550]. На некаторых карцах, як на выдатным узоры з в. Асташкавічы (КП 1968) і на вельмі падобным да яго карцы без анатацыі (КП 1997), у кола ўпісаны крыж. Спалучэнне кола і крыжа шырока вядома ў старажытных культурах і сустракаецца з часоў неаліту [22, с. 552]. З касым крыжам з эпохі неаліту таксама звязана сімволіка сонца [21, с. 119]. Салярны знак у спалучэнні з пластычным вобразам качкі і каня - сімваламі руху свяціла на рытуальным посудзе меў таксама ахоўную сімволіку [22, с. 504-506]. Не будзе перабольыианнем сцвярджаць, што мастацка-пластычныя арніта- і зааморфныя вобразы драўляных карцоў данеслі да нас рэшткі старажытнейшых міфалагічных уяўленняў, індаеўрапейскія міфалагемы, якія не захавала вербальная традыцыя беларусаў. Гэтым яны вельмі каштоўныя для рэканструкцыі беларускай міфалогіі і рытуалаў. Птушыная вобразнасць карцоў наводзіць на думку, што такія рэчы ўжываліся ў пахавальна-памінальнай абраднасці як абрадавы посуд, пластычна ўвасабляючы душы памерлых, продкаў - дзядоў, якія ўяўляліся птушкамі, аб чым сведчыць беларускі фальклор [23, с. 377].

Вобразы вадаплаўных птушак, пеўня, каня ў карцах пластычна выяўлены ў дыяпазоне ад распазнавальнасці іх першавобразаў да лаканічнасці знака-сімвала. На некаторых карцах невялічкая ручка (адростак ад масіву тулава) не мае ніякіх выяўленчых форм ці мінімальна апрацавана і толькі знакава пазначае першасную семантыку рэчы як сімвалічнай выявы птушкі на водах (КП 1981, КП 1987, КП 1996, КП 2003, КП 2139). На іншых выразна выяўлена галава каня (КП 1983, КП 1988, КП 2000), птушкі (КП 1975, КП 1976, КП 1977), грэбня ці хваста пэўня (КП 1974, КП 1989).

Выяўленча-пластычныя формы драўляных карцоў нараджаліся дзякуючы ўжыванню старажытнай тэхнікі дзяўбання і выразання пры дапамозе нажа. Пры іх вырабе выкарыстаны таксама тэхнікі контурнай, трохгранна-выямчатай разьбы, выпальвання, якія ў народнай лексіцы беларусаў вызначаліся словам «пісаць», а прадметы, аздобленыя пры іх дапамозе - «пісаныя». «Пісанне» было спосабам нанясення на драўляныя формы пэўных магічных знакаў і аздаблення іх дэкорам. У музейных анатацыях да некаторых фотаздымкаў карцоў пазначаны і намаляваны іх узоры: ромб з падоўжанымі канцамі (КП 2031), ромб з крыжам унутры і двума падоўжанымі хвосцікамі (КП 1965). Згадваюцца ў музейных апісаннях гэтых прадметаў і іншыя знакі: касыя крыжы, лукатка.

«Пісаныя» на карцах знакі: ромбы, адзіночны касы крыж, дарожка з касых крыжоў ці касых крыжоў з рыскамі паміж імі, касы крыж у прамакутніку, спіраль, лукаткі з рысак, лукаткі з трохкутнікаў, выявы ёлачак, шасціпялёсткавая разетка - належаць да арсеналу найбольш старажытных арнаментальных сімвалаў, вядомых чалавецтву. Іх выявы на драўляных карцах падобныя на архаічную арнаментыку археалагічнай керамікі, што наносіла рука чалавека на гліну з часоў палеаліту. Адзінкавы характар арнаментальных знакаў (ромб, спіраль, касы крыж) дазваляе меркаваць, што калісь у іх укладаўся сакральна-магічны сэнс: пажаданне і прадуцыраванне блага і дабра, моцы аховы.

Увядзенне ў культурны ўжытак і далейшае навуковае асэнсаванне калекцыі драўляных карцоў з архаічным арнаментам дазваляе запоўніць лакуны ў беларускім народным мастацтве, якая тычыцца мастацкай апрацоўкі дрэва і гендэрнай размеркаванасці беларускай арнаментацыі, якая, як лічылася да гэтага часу, амаль цалкам належыць у беларусаў да жаночай творчасці.

Пакуль можна толькі паставіць пытанне аб невядомых раней арнаментальных знаках: ромбах з адгалінаваннямі з трох вуглоў і двума падоўжанымі крывымі канцамі, якія змешчаны на ручках двух карцоў са збору НГМ РБ (КП 1967, КП 2031) - ці маюць яны якую семантыку, ці з'явіліся ў выніку мастацкай трансфармацыі контуру арнаментальнай фігуры, згодна з выгібам формы драўлянай ручкі?

Менавіта архаічны стыль надае беларускім карцам рысы этнічнай характэрнасці. Асабліва яскрава яны выяўляюцца пры іх параўнанні з падобнымі вырабамі іншых народаў, што ужо было раней адзначана Я. Сахутай [13, с. 67]. Разнастайнасць форм, пластычнага і арнаментальнага вырашэння драўляных карцоў, якія не паўтараюцца, сведчыць аб тым, што яны выраблялiся вясковымі майстрамі ў асноўнай сваёй масе індывідуальна, для ўласных патрэб. У к. XIX - пач. XX ст. гэтыя рэчы страцілі сваё культавае прызначэнне, чым можна патлумачыць, што яны пачалі трапляць у музейныя зборы. У гэты час драўляныя карцы з фігурнымі ручкамі рабілі таксама на продаж і для выставак майстры-саматужнікі. Аб гэтым сведчаць амаль аднолькавыя па форме

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вырабы з Дзісненскага павету даваеннага збору НГМ РБ (КП 1192) і Віленскага павету 1913 г. з калекцыі Нацыянальнага музея Літвы (ЕМ 257). У названых музеях ёсць і іншыя вельмі блізкія па форме карцы з вертыкальнай ручкай і больш дасканалай разьбой і апрацоўкай. У Мінску захоўваецца два амаль аднолькавых па форме коўшычкі, месца паходжання якіх невядома (КП 1973, КП 1999).

А ў Вільнюсе захоўваецца карэц для гарэлкі XIX ст. з Укмергскага павету Тауенскай воласці (Paazuoliu k. Taujenu valscius, Ukmerges apskritis), які знаходзіўся раней ў калекцыі Літоўскага навуковага таварыства, заснаванага Ёнасам Басанавічусам (ЕМ 301). Вядомыя каўшы з ланцугамі, выразаныя з суцэльнага кавалку дрэва, якія рабіліся для экспанавання на саматужных выстаўках. Такі экспанат са Слонімскага павету ёсць у НГМ РБ (КП 2018).

М. Кацар у кнізе «Народно-прикладное искусство Белоруссии» пераказаў аповед свайго дзеда Маркіяна Кацара аб тым, што ў памешчыцы маёнтка Клімавічы Раснянскай воласці Сенненскага павету Е. А. Завіленскай быў сталяр Арцём Маркевіч, які сярод іншага рабіў чарпачкі для гарэлкі з ручкай у выглядзе шэі лебедзя ці хваста вавёркі [18, с. 120].

**На заканчэнне.**

Напрыканцы ўзгадаем яшчэ раз архіўныя фотадакументы, якія далі магчымасць вярнуць значнай частцы цудоўных твораў беларускага народнага разьбярства іх гісторыю і месца паходжання, зазначыць ролю В. Ластоўскага ў іх збіранні і вывучэнні, паставіць пытанні для далейшых пошукаў згубленых крыніц па гісторыі беларускай этнаграфіі і народнага мастацтва. Належыць з удзячнасцю узгадаць імя А. Мальдзіса, які вярнуў гэты каштоўны дакумент у выглядзе копіі на Беларусь. Можна меркаваць, што фотаздымкі, якія належалі Беларускаму дзяржаўнаму музею, падчас Другой сусветнай вайны былі вывезены з Мінска за мяжу. Гэта лонданская знаходка ўтрымлівае шмат іншых каштоўных матэрыялаў, якія даследчыкі яшчэ павінны асэнсаваць.

**Крыніцы:**


1. Акт и опись музейных экспанатаў, возвращенных в БССР из Германии. 1947 г. // Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. З гісторыі даваенных збораў. Страты і вяртанні. Дакументы і фотаздымкі. Віртуальная выстаўка [Электронны рэсурс]. - Электрон, дан. (1,21 Гб). - Мінск: Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны архіў Рэспублік Беларусь, ТАА Дзью Поінт, [б. г.]. - 1 электрон, опт. дыск (DVD).

2.Фатаграфіі катэдры этнаграфіі, зробленыя летам 1928 года пад кіраўніцтвам В. Ластоўскага па маршруце Слуцк - Асташкавічы// Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі, фр 445 [мікрафільм],ЭД 126рк, Эд 127рк [алічбоўка].

3. Прохарова, Н„ Сівохін, Г. Да пытання пра «факальныя пункты» традыцыйнай беларускай культуры (па матэрыялах са збору Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі) / Н. Прохарава, Г. Сівохін // Музейны веснік. Вып. 3. / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. - Мінск: Юніпак, 2006. - С. 80-93.

4. Кочерга, Н.К., Ревегук, В.Я. Репрессивные меры сталинизма против научной интеллигенции Полтавщины / Е.К. Кочерга, В.Я. Ревегук // Террор на Полтавщине. Статьи [Электронный рэсурс]. - Рэжым доступу: http://poltava-repres.narod.ru/statti/intell_ru.htm. - Дата доступу: 02.09.2011.

5. Нікольскі, Н.М. Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераньнях беларускага сялянства. / Н.М. Нікольскі // Працы секцыі этнаграфіі Бел. Акад. навук / Інстытут гісторыі імя М.Н. Пакроўскага. Вып, 3. - Менск, 1933.

6. Сахута, Я. Народная разьба па дрэву. / Я. Сахута. - Мінск: Вышэйшая школа, 1978.

7. Лабачэўская В.А. Зберагаючы самабытнасць: З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі. / В.А. Лабачэўская. - Мінск: Беларуская навука, 1998.

8. Историко-этнографический музей княгини М. К. Тенишевай в Смоленске. Общий каталог. - Смоленск: Электро-типо-лит. Я. Н. Подземского, 1909.

9. Гужалоўскі, А.А. З гісторыі фондавага збору Беларускага дзяржаўнага музея у 20-я гг. XX ст./А.А. Гужалоўскі // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. I. / рэдкал.: С.М. Ходзін (адк. рэдактар) [і інш.]. - Мінск: БДУ, 2002. - С. 192-199.

10. Янушкевіч, Я. Неадменны сакратар Адраджэння: Вацлаў Ластоўскі./Я. Янкушкевіч. - Мінск: Навука і тэхніка, 1995.

11. Нікольскі, Н.М. Устаноўкі і метады беларускай нацдэмаўскай этнаграфіі / Н.М. Нікольскі // Працы сэекцыі этнаграфіі. Вып. IV. / Ін-т гісторыі імя М. Н. Пакроўскага Беларускай Акадэміі навук. Мінск, 1938.

12. Інвентарная кніга Музею ім. Ів. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні. № 1. // Спадчына. - 1995.-№ 5.-С. 163-190.

13. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусь/ Я.М. Сахута. - Мінск: БелЭн, 1997.

14. Кацер, М.С. Народно-прикладное искусство Белоруссии (от первобытного общества до 1917 г.). / М.С. Кацер. - Мінск: Вышэйшая школа, 1972.

15. Старкова, Ю.Ю. Братчина-пир в языческой традиции Древней Руси / Ю.Ю. Старкова // Жертвоприношение: Ритуал в культуре и искусстве от древности до наших дней (сборник статей) / Научн. ред. Л.И. Акимова и А.Г. Кифишин. - М.: Языки русской культуры. 2000. - С. 253-265.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. Валодзіна, Т., Дучыц, Л., Зайкоўскі, Э. Мёд // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. / склад. Т. Клімковіч [і інш.], рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. - Мінск: Беларусь, 2011. - С. 306.

17. Вуглік, І., Дучыц, Л. Піва // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. / склад. Т. Клімковіч [і інш.], рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. - Мінск: Беларусь, 2011. - С. 361.

18. Федоров, Р.Ю. Обряд «Свеча» у белорусских переселенцев в Западной Сибири / Р.Ю. Федоров // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / навук. рэд. А.І. Лакотка. Вып. 10. - Мінск: Права і эканоміка, 2011.-С. 465-469.

19. Валодзіна, Т. Гарэлка // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. / склад. Т. Клімковіч [і інш.], рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. - Мінск: Беларусь, 2011. - С. 117-118.

20. Иванов, В.В., Топорков, В.Н. Птицы. / В.А. Иванов, В.Н. Топорков // Мифы народов мира. Энцыклапедия: в 2 томах. / Гл. реж. С.А. Токарев. - Москва: НИ «Большая Российская энциклопедия», 1997. Т. 2. - С. 346-349.

21. Голан, А. Миф и ритуал. / А. Голан. - 2-е изд. - Москва: Русслит, 1994.

22. Рыбакоў, Б. А. Язычество Древней Руси. / Б.А. Рыбаков. - Москва: Наука, 1987.

23. Валодзіна, Т., Сахута,Я. Птушкі // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. / склад. Т. Клімковіч [іінш.], рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. - Мінск: Беларусь, 2011. - С. 377-378.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ